**9. Знешнеэканамічныя сувязі.** Сярод найважнейшых відаў экспартнай прадукцыі Віцебскай вобласці — нафтапрадукты, правады і кабелі, малочная і мясная прадукцыя, тэлевізары, палімеры этылену, шкловалакно і вырабы з яго, абутак, алей рапсавы.

**Падвядзём вынікі.** Віцебская вобласць — адна з самых забяспечаных воднымі рэсурсамі. Галіны спецыялізацыі: нафтаперапрацоўка і хімічная прамысловасць, вытворчасць электраэнергіі, ільняных тканін і дываноў. Віцебская вобласць мае высокі рэкрэацыйны патэнцыял тэрыторыі.

***Праверце сябе.*** 1. Ахарактарызуйце прыродныя рэсурсы Віцебскай вобласці. 2. Назавіце галіны спецыялізацыі прамысловасці вобласці.

***Праблемныя пытанні.*** 1. Якія фактары абумовілі ўзнікненне самых старых і самых маладых гарадоў вобласці? 2. Вызначце ўзаемасувязь паміж прыродна-кліматычнымі ўмовамі і спецыялізацыяй сельскай гаспадаркі вобласці.

***Ад тэорыі да практыкі.*** З выкарыстаннем дадатковага матэрыялу складзіце геаграфічны партрэт вобласці, вылучыце асноўныя прыродныя, сацыяльныя і эканамічныя характарыстыкі тэрыторыі.

## § 46. Гомельская вобласць

***Успомніце.*** *Які рэгіён Беларусі з’яўляецца найбагацейшым на карысныя выкапні? Якая тэрыторыя найбольш пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС?*

**1. Роля вобласці ў гаспадарцы краіны.** Па ўдзельнай вазе валавога рэгіянальнага прадукту ў ВУП краіны (11,8 %) Гомельская вобласць саступае толькі Мінску і Мінскай вобласці. Па ўдзельнай вазе ў агульнарэспубліканскім аб’ёме прамысловай вытворчасці знаходзіцца на другім месцы, а па вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі — на чацвёртым (мал. 145).

Па карце атласа (с. 77) вызначце ўдзельную вагу вобласці ў колькасці насельніцтва Беларусі.

**2. Геаграфічнае становішча вобласці.** Гомельская вобласць размяшчаецца на паўднёвым усходзе Беларусі і мяжуе з Расіяй і Украінай. Частка тэрыторыі пасля аварыі на ЧАЭС апынулася ў межах зоны адчужэння. У вобласці знаходзіцца самы паўднёвы пункт краіны. Вобласць самая буйная ў краіне па плошчы — 40,4 тыс. км$^2$.

**3. Прыродныя рэсурсы.** Складаная геалагічная будова абумовіла багацце карысных выкапняў у Гомельскай вобласці.

У вобласці размешчана Прыпяцкая нафтагазаносная зона. На захадзе і поўдні вобласці разведаны радовішчы бурага вугалю і гаручых сланцаў. Гомельская вобласць мае вялікія запасы калійных і каменнай солей. Разведаны радовішчы шкловых і фармовачных пяскоў, гіпсу, кааліну, рэдкіх і рэдказямельных металаў, будаўнічага каменю і інш. Распрацоўваюцца радовішчы торфу і сапрапеляў.

Тэрыторыя вобласці размешчана ў межах Палескай і Прыдняпроўскай нізін з высокай забалочанасцю і лясістасцю. Сельскагаспадарчыя землі займаюць 31,4 % тэрыторыі, што значна менш, чым у іншых абласцях. Тут шырока распаўсюджаны дзярновыя забалочаныя, тарфяна-балотныя і пойменныя глебы. Больш за палову сельскагаспадарчых угоддзяў займаюць меліяраваныя землі.

Якія сярэднія тэмпературы студзеня і ліпеня, а таксама які вегетацыйны перыяд характэрныя для паўднёвага ўсходу краіны?

Агракліматычныя рэсурсы спрыяльныя для развіцця сельскай гаспадаркі. У выніку пацяплення клімат набліжаецца да лесастэпавага. Вобласць забяспечана і воднымі рэсурсамі. Тут працякаюць самыя буйныя і паўнаводныя рэкі краіны: Дняпро, Прыпяць, Сож, Бярэзіна і інш. Шырокія поймы рэк абумовілі фарміраванне вялікай колькасці азёр-старыц. З буйных азёр рэшткавага паходжання вылучаецца возера Чырвонае ў Жыткавіцкім раёне.

На картах атласа (с. 6—7, 76) знайдзіце найбуйнейшыя рэкі і азёры.

Лясістасць у Гомельскай вобласці максімальная ў краіне і складае 47 %. Прыродаахоўныя тэрыторыі ў вобласці займаюць адносна невялікую частку — 7,5 %. Па колькасці ААПТ вобласць пераўзыходзіць толькі Магілёўскую. Тут знаходзяцца НП «Прыпяцкі», крыху больш за 10 заказнікаў і 10 помнікаў прыроды рэспубліканскага значэння. Вобласць характарызуецца наяўнасцю рэгіянальных экалагічных праблем. Тут размяшчаецца зона адчужэння з Палескім радыяцыйна-экалагічным запаведнікам. Гэта ўнікальная пляцоўка для вывучэння ўздзеяння радыяцыі на жывыя арганізмы.

Па карце атласа (с. 29) «Прагноз забруджання тэрыторыі цэзіем-137» (на 2050 г.) вызначце, як зменіцца шчыльнасць забруджання тэрыторыі Гомельскай вобласці.

**4. Насельніцтва.** Па колькасці насельніцтва (1338,6 тыс. чал.) Гомельская вобласць займае трэцяе месца пасля Мінска і Мінскай вобласці. Па шчыльнасці насельніцтва (33 чал./км$^2$) пераўзыходзіць толькі Віцебскую. Гарадское насельніцтва складае 78 %. Геаграфічнае становішча вобласці абумовіла значную долю рускіх (каля 8 %) і ўкраінцаў (каля 2 %).

Успомніце асаблівасці сельскага рассялення на Палессі. Як аварыя на ЧАЭС паўплывала на размяшчэнне насельніцтва?

**5. Прамысловасць.** На долю прамысловасці прыпадае 36,9 % ВРП вобласці (мал. 151). Тут працуе больш за 1500 прадпрыемстваў. Гомельская вобласць характарызуецца найбольш развітой горназдабыўной прамысловасцю. На яе долю прыпадае 4,2 % прамысловай вытворчасці.

У Гомельскай вобласці сканцэнтраваны ўвесь аб'ём здабычы нафты і спадарожнага газу, шкловых і фармовачных пяскоў і інш. У Рэчыцы працуе адзіны ў краіне газаперапрацоўчы завод.

У структуры апрацоўчай прамысловасці лідзіруюць вытворчасць нафтапрадуктаў, металургічная і харчовая прамысловасць. Галоўная галіна спецыялізацыі — нафтаперапрацоўка. Мазырскі НПЗ вырабляе амаль палову прамысловай прадукцыі вобласці. На другім месцы па аб'ёме прамысловай прадукцыі знаходзіцца металургія. Беларускі металургічны завод у Жлобіне вырабляе амаль 100 % сталі і пракату ў краіне.

Назавіце цэнтры вытворчасці прадукцыі харчовай прамысловасці Гомельскай вобласці.




Мал. 151. Структура ВРП Гомельскай вобласці, 2023 г., %

Самая вядомая прадукцыя харчовай прамысловасці: малочныя кансервы, харчовая соль, маргарын, цукеркі, сыры.

Машынабудаўнічыя прадпрыемствы размяшчаюцца ў Гомелі і буйных гарадах. Яны выпускаюць корма- і збожжаўборачныя камбайны, металаапрацоўчыя станкі і іншую прадукцыю. У вобласці развіта хімічная вытворчасць. Тут выпрацоўваецца практычна ўсе фосфарныя ўгнаенні краіны. Выпускаюць хімічныя валокны, мыла і мыйныя сродкі.

Назавіце прадпрыемствы, якія выпускаюць пералічаную прадукцыю.

Гомельская вобласць — адзіны вытворца ў краіне фарфора-фаянсавага посуду, ліставога шкла.

Гомельскі завод «Крышталь» выпускае ювелірныя вырабы. Гэта адзінае ў Беларусі прадпрыемства, якое займаецца агранкай закупленых у Расіі алмазаў. Прадукцыя прадпрыемства добра вядома як у Беларусі, так і за яе межамі.

Добра развіта дрэваапрацоўчая, мэблевая і цэлюлозна-папяровая прамысловасць. Найбольшае значэнне мае вытворчасць драўнянай цэлюлозы, паперы і кардону, школьных сшыткаў, шпалер, мэблі.

Назавіце цэнтры вытворчасці пералічанай прадукцыі.

З-за раўніннага рэльефу ў вобласці няма ГЭС. Практычна ўся электраэнергія выпрацоўваецца на ЦЭЦ, якія працуюць у Гомелі, Светлагорску, Мазыры і Добрушы. Чаму яны размешчаны менавіта ў гэтых гарадах? Якія альтэрнатыўныя крыніцы электраэнергіі выкарыстоўваюцца ў Гомельскай вобласці?

Для прыцягнення інвестыцый і стварэння сумесных прадпрыемстваў функцыянуе свабодная эканамічная зона «Гомель-Ратон». Каля 50 % прадукцыі, якая выпрацоўваецца ў рэгіёне, ідзе на экспарт.

**6. Структура і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі.** У структуры ВРП вобласці на долю сельскай, лясной і рыбнай гаспадаркі прыпадае 8,2 %. Спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, кормавытворчасці ў спалучэнні са збожжавай гаспадаркай, развітым бульбаводстве і агародніцтве. Вакол Гомеля сфарміравалася зона прыгараднай спецыялізацыі сельскай гаспадаркі. У структуры пасяўных плошчаў найбольшая доля (56 %) прыпадае на кармавыя культуры, на другім месцы — збожжавыя (36 %). Па валавых зборах збожжа вобласць займае апошняе месца ў краіне. У цяперашні час плошчы пасеваў рапсу і гародніны павялічыліся, а бульбы і лёну — зменшыліся. Вытворчасць

жывёлагадоўчай прадукцыі ў вобласці таксама невялікая. Па валавой вытворчасці мяса і малака Гомельская вобласць саступае многім рэгіёнам краіны.

Падумайце, з чым звязаны змены ў плошчах пасеваў рапсу, гародніны, бульбы, лёну.

**7. Геаграфія сферы паслуг.** Удзельная вага сферы паслуг у Гомельскай вобласці — 44 % ВРП. Па працягласці чыгунак і аўтамабільных дарог, грузаабароце вобласць займае адно з апошніх месцаў у краіне. У грузаабароце значная роля належыць трубаправоднаму транспарту. Колькасць аб'ектаў сацыяльна-культурнай сферы невялікая. Неабходнасць узмацнення медыцынскага кантролю за насельніцтвам, якое пацярпела ад радыеактыўнага забруджвання, прывяла да развіцця аховы здароўя. У вобласці развіта сетка аб'ектаў сферы адукацыі: функцыянуе шэсць універсітэтаў, больш за 30 каледжаў і ліцэяў. Вобласць вылучаецца па колькасці помнікаў і музеяў.

Турысцкім брэндам Гомельскай вобласці з'яўляецца двухдзённы маршрут «Залатое кальцо Гомельшчыны», які праходзіць праз Гомель, Ветку, Чачэрск, Чырвоны Бераг, Тураў, Мазыр, Юравічы, Рэчыцу, Лоеў.

Прааналізуйце карты атласа (с. 61—71) і знайдзіце аб'екты сферы паслуг.

**8. Найбуйнейшыя эканамічныя цэнтры вобласці. Гомель** — найбуйнейшы прамысловы і культурны цэнтр вобласці. Ён мае перыферыйнае становішча і знаходзіцца на ўсходзе вобласці на рацэ Сож. Горад заснаваны ў XII ст., цяпер ён другі ў краіне па колькасці насельніцтва (501,1 тыс. жыхароў). Прамысловасць спецыялізуецца на машынабудаванні і металаапрацоўцы, хімічнай вытворчасці. Найбуйнейшыя прадпрыемствы — «Гомсельмаш» і Гомельскі хімічны завод. Таксама ў горадзе вырабляюцца шпалеры, мэбля, ліставое шкло, прадукцыя харчовай прамысловасці.

Якую прадукцыю выпускаюць «Гомсельмаш» і Гомельскі хімічны завод?

Развітая сфера паслуг. Тут працуюць тэатры, музеі, цырк і філармонія. Галоўнай славутасцю горада з'яўляецца Гомельскі палацава-паркавы ансамбль (мал. 152, *б*).

Другім па колькасці насельніцтва і прамысловым значэнні горадам у вобласці з'яўляецца **Мазыр** (105,1 тыс. жыхароў). Градаўтваральнае прадпрыемства — Мазырскі НПЗ. У горадзе вырабляецца больш за 80 % харчовай солі. Гэта адзін з найбуйнейшых рачных партоў краіны. З аб'ектаў сацыякультурнай сферы найбольшае значэнне мае педагагічны ўніверсітэт.



а



б

Мал. 152. Помнікі архітэктуры Гомельскай вобласці:
*а* — кафедральны Сабор Свяціцеляў Кірылы і Лаўрэнція Тураўскіх у Тураве;
*б* — Гомельскі палацава-паркавы ансамбль

Адзін з найбуйнейшых прамысловых цэнтраў вобласці — **Жлобін** (76,8 тыс. жыхароў). Размяшчаецца на поўначы вобласці на рацэ Дняпро. Галоўнае прадпрыемства — Беларускі металургічны завод. У горадзе выпускаецца таксама прадукцыя харчовай і лёгкай прамысловасці.

Буйныя гарады вобласці: Светлагорск, Рэчыца, Рагачоў, Калінкавічы.

**9. Знешнеэканамічныя сувязі.** Гомельская вобласць экспартуе чорныя металы і вырабы з іх, малочную прадукцыю, нафтапрадукты, мінеральныя змешаныя ўгнаенні, сельскагаспадарчую тэхніку, цэлюлозу, мэблю, пластмасы і вырабы з іх, соль.

**Падвядзём вынікі.** Гомельская вобласць — самая вялікая па плошчы ў Беларусі. Забяспечана мінеральнымі рэсурсамі. Вядучая ў краіне па здабычы нафты і газу, вытворчасці фосфарных угнаенняў, сталі, пракату, збожжа- і кармаўборачных камбайнаў, харчовай солі.

***Праверце сябе.*** 1. Якія радовішчы карысных выкапняў распрацоўваюцца ў Гомельскай вобласці? 2. Чаму ў вобласці самы нізкі ўзровень сельскагаспадарчага асваення? 3. Назавіце галіны спецыялізацыі вобласці. 4. Якія віды прамысловай прадукцыі вырабляюцца толькі ў Гомельскай вобласці?

***Праблемныя пытанні.*** Якія фактары абумовілі размяшчэнне ў Жлобіне металургічнага завода, а ў Светлагорску — аб'яднання «СветлагорскХімвалакно» і цэлюлозна-кардоннага камбіната?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Падрыхтуйце паведамленні пра буйныя гарады вобласці.

# § 47. Гродзенская вобласць

***Успомніце.*** *У межах якой фізіка-геаграфічнай правінцыі ў асноўным размешчана Гродзенская вобласць? Якое тапанімічнае значэнне мае айконім Гродна?*

**1. Роля вобласці ў гаспадарцы краіны.** Удзельная вага ВРП Гродзенскай вобласці ў фарміраванні ВУП складае 10,9 % (пятае месца ў краіне). Гродзенская вобласць па ўдзельнай вазе ў агульнарэспубліканскім аб'ёме прамысловай вытворчасці знаходзіцца на шостым месцы, а па вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі — на трэцім (мал. 145).

Па карце атласа (с. 79) вызначце ўдзельную вагу вобласці ў колькасці насельніцтва Беларусі.

**2. Геаграфічнае становішча вобласці.** Гродзенская вобласць самая маленькая ў краіне па плошчы — 25,1 тыс. км$^2$. Яна размешчана на паўночным захадзе краіны. На захадзе мяжуе з Польшчай, на паўночным захадзе — з Літвой. У апошнія гады транзітнае значэнне вобласці знізілася.

**3. Прыродныя рэсурсы.** Карысных выкапняў у вобласці адносна няшмат і звязаны яны ў асноўным з чацвярцічнымі адкладамі. Распрацоўваюцца радовішчы торфу, здабываюцца сапрапелі, цэментныя гліны, будаўнічыя пяскі, пясчана-жвіровы матэрыял. У Ваўкавыскім і Гродзенскім раёнах распрацоўваюцца адны з найбуйнейшых у краіне радовішчаў мелу і мергелю. Адкрыта Навасёлкаўскае радовішча жалезных руд.

Тэрыторыя вобласці характарызуецца разнастайным рэльефам: узвышшы чаргуюцца з раўнінамі і нізінамі. Тут знаходзяцца Навагрудскае і Ашмянскае ўзвышшы з адзнакамі вышэй за 300 м, а таксама самы нізкі пункт краіны.

Знайдзіце на карце атласа (с. 6–7, 78) узвышшы і іх найвышэйшыя адзнакі, а таксама самы нізкі пункт.

У глебавым покрыве пераважаюць даволі ўрадлівыя дзярнова-падзолістыя супясчаныя глебы. У структуры зямельнага фонду вобласці сельскагаспадарчыя землі займаюць 47,5 % (першае месца ў краіне), а разаранасць складае каля 32 %.